

Будынак былога кінатэатра «Гродна» па Савецкай у гістарычным цэнтры горада над Нёманам, які прастаяў больш за дзесяць гадоў, атрымлівае другое жыццё. Цяпер тут завяршаюцца будаўнічыя работы. СТАР 2



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

31 КАНАЛ

Анонс лепшых фільмаў на кожны дзень.



Семяжаўцы адрозніваліся ад суседзяў паводзінамі, побытам, характарам. Яны не надта любілі адпачываць, таму і жылі багата. Затое і скупаватымі былі, і ганарлівымі. Чужакоў блізка да сябе не падпускалі. СТАР 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 МАЯ 2012 г. ПЯТНІЦА № 98 (27213) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## МЗС БЕЛАРУСІ МОЖА БЫЦЬ СТРУКТУРНА РЭФАРМАВАНА ДЛЯ ЎЗМАЦНЕННЯ ЗНЕШНЕГАНДЛЁВАГА НАПРАМКУ

**Магчымасць структурнага рэфармавання МЗС Беларусі для ўзмацнення знешнегандлёвага напрамку абмяркоўвалася 24 мая ў ходзе даклада міністра замежных спраў Сяргея Мартынава Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку.**

Як адзначыў Прэзідэнт, у бліжэйшым будучым у знешняй палітыцы Беларусі чакаюцца знакавыя падзеі, да якіх неабходна падрыхтавацца. Перш за ўсё, размова ішла аб змястоўным напаўненні маючага адбыцца афіцыйнага візіту Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна. «Мяне цікавяць новыя напрамкі супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй, каб мы маглі іх сур'ёзна абмеркаваць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, нагадаўшы, што раней ужо даручаў прэм'ер-міністру Міхаілу Мясніковічу прапрацаваць такія напрамкі.

Таксама кіраўнік дзяржавы папрасіў Сяргея Мартынава далажыць аб сітуацыі на еўрапейскім напрамку. «Я ўсё больш чую заяў аб тым, што еўрапейскія дыпламаты тут чакаюць нейкай амністыі, ізноў пачынаюць размову па палітзняволеных і гэтак далей, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Я адразу хачу публічна сказаць, што да гэтай тэмы я больш не вярнуся. Я ўсё сказаў публічна і раней у Пасланні беларускаму народу і парламенту. Сваю пазіцыю я не бачу падстаў цяпер мяняць».

«Мы чакаем канкрэтных крокаў ад Захаду, Еўрапейскага саюза. Мяч на іх баку. Гэта маё цвёрдае перакананне. Таму чакаць зноў гэтай гульні на старых інструментах па старых нотах я не збіраюся», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы даў даручэнні аб тым курсе, якога Беларусь павінна прытрымлівацца для нармалізацыі адносін з заходнімі партнёрамі пры няўхільным захаванні нацыянальных інтарэсаў, а таксама заходзячы з мэт нармальнага і плённага ўзаемадзеяння.

Яшчэ адна тэма, якую абазначыў Аляксандр Лукашэнка, — магчымасць структурнага рэфармавання МЗС у частцы ўзмацнення знешняга гандлю: «Я ўжо аб гэтым гаварыў. Знешнеэканамічная дзейнасць у плане нарматыўна-прававой базы — гэта добра, але нам цяпер вельмі трэба ўзмацняць знешні гандаль. Ці прапрацоўвалася гэта пытанне, і як Вы на яго глядзіце?»

Сяргей Мартынаў прадставіў Аляксандру Лукашэнку аглядны даклад па асноўных вектарах знешнепалітычнай дзейнасці, падрыхтоўцы маючых адбыцца мерапрыемстваў. «Мы прадаўжаем сур'ёзна і актыўна працаваць над шматвектарнасцю нашай палітыкі, і наступныя тыдні і месяцы будуць добрай дэманстрацыяй менавіта такога шматвектарнага падыходу, характэрнага для Беларусі».

Акрамя пытанняў супрацоўніцтва Беларусі з Расіяй і Еўразіяй, Прэзідэнту было далажана аб развіцці адносін з азіяцкімі і лацінаамерыканскімі дзяржавамі, абмеркаваны запланаваныя канкрэтныя мерапрыемствы на гэтых вектарах. Прэзідэнт даў даручэнні аб падрыхтоўцы і змястоўнай часткі шэрагу яго візітаў у гэтыя рэгіёны.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## БЕЛАРУСЬ ПРАПАНУЕ БАНГЛАДЭШ ВЫБУДОЎВАЦЬ СТРАТЭГІЧНЫЯ ДВУХБАКОВЫЯ АДНОСІНЫ

**Аб гэтым учора заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, сустракаючыся з міністрам замежных спраў Бангладэш Дзіпу Моні, перадае БЕЛТА.**

«Мы чакалі гэтага візіту. Вельмі спадзяёмся на тое, што ён закладзе фундамент нашых стратэгічных адносін у будучым», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, Бангладэш з вялікай колькасцю насельніцтва ўяўляе для Беларусі значны інтарэс. «Упэўнены, што Бангладэш з задавальненнем цераз Беларусь зможа прамы выхад у Еўропу», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. У дзвюх краін абсалютна падобныя падыходы ў міжнародных арганізацыях: «Мы вельмі цэнім тое, што вы заўсёды падтрымліваеце Беларусь. Вы павінны ведаць, што Беларусь адкажа Бангладэш тым жа», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Што датычыцца ўзаемнага гандлю, Прэзідэнт адзначыў, што па выніках 2011 года склаўся значны таваразварот у памеры каля $140 млн. «У гэтым годзе мы не так актыўна гандлюем, але я задаволены, што напярэдадні яшчэ год. У нас ёсць вельмі шмат тавараў, чым мы можам удзельнічаць у Бангладэш. Мы таксама зацікаўлены ў пастаўках вашай прадукцыі ў Беларусь. І калі мы ўзгоднім тайварныя пазіцыі, я вам гарантую, што мы аддадзім перавагу вашым таварам», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што не толькі ў палітыцы, але і ў эканоміцы ў краін ёсць агульныя інтарэсы, па якіх будзе развівацца супрацоўніцтва.

У гэтым годзе прэм'ер-міністр Беларусі наведае з візітам Бангладэш. У плане падрыхтоўкі гэтага візіту Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што хацеў бы, каб міністры замежных спраў Беларусі і Бангладэш вызначылі да нюансаў напрамкі супрацоўніцтва, канкрэтныя механізмы, групы тавараў для ўзаемнага гандлю. Прэзідэнт Беларусі перадаў запрашэнне прэзідэнту і прэм'ер-міністру Бангладэш наведаць Беларусь. «Думаю, што гэта было б важна ў плане ўстанаўлення нашага партнёрства». У сваю чаргу Дзіпу Моні падкрэсліла, што ў краін ёсць шмат агульнага, а эканомікі Беларусі і Бангладэш узаемадапаўняльныя.

# Са святам, малады старажытны горад!



Фота БЕЛТА.

# ПОЛАЦК СЯБЕ ПАКАЖА!



## «Бацька гарадоў беларускіх» святкуе 1150-ю гадавіну

**Старажытны Полацк святкуе сваё 1150-годдзе. Якім будзе свята? Пра гэта расказвае старшыня Полацкага гарвыканкама Аляксандр ПАЗНЯК.**

**— У Полацк штогод прыязджае шмат турыстаў. А ці шмат горад зарабляе на турызме?**

— У Полацку летась пабывалі 250 тысяч турыстаў і 55 тысяч паломнікаў. Кожны пакінуў тут у сярэднім усяго па сем тысяч рублёў. У выніку горад атрымаў 2,1 мільярда ад усіх арганізаваных турысцкіх груп. А ўсё таму, што пакуль не развіта турыстычная інфраструктура: не хапае аб'ектаў харчавання, гатэляў. У асноўным людзі прыехалі, паглядзелі храмы і паехалі...

Але ўсё неабходнае для турыстаў будзе створана. У першую чаргу гэта датычыцца Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра, вядомага месца паломніцтва і аб'екта масавага наведвання турыстаў. Першачарговая задача — стварыць у ім турыстычную інфраструктуру. Да варот манастыра вядзе паўкіламетровая пешаходная дарожка, таму спецтранспарт будзе рухацца па нанова пабудаваных дарогах-дублёрах з аўтастаянкамі. Турыстам, якія наведаюць Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр, адкрыецца захапляльная панарама: узноўленая капліца Мікалая Цудатворца і помнік яму. Турысты, паводле нашых задумак, змогуць размясціцца ў трохзоркавым гасцінічным комплексе, у VIP-апартаментах, а ў вольны час — наведаць гандлёвыя рады з сувенірнымі, іконнымі, антыкварнымі, ювелірнымі, рамесніцкімі, кніжнымі і іншымі крамамі ці адпачыць каля дэкаратыўнага музычнага фантана.

У гістарычным будынку, які цяпер належыць лясному каледжу, размесціцца духоўна-асветніцкі цэнтр з канферэнц-залай, музеем праваслаўнага мастацтва і епархіяльным вучылішчам.

**— Але, напэўна ж, самы прывабны аб'ект для турыстаў — Сафійскі сабор, які знаходзіцца на тэрыторыі Верхняга Замка.**

— Па сутнасці, гэта археалагічны, адміністрацыйна-духоўны і свецкі цэнтр горада, які займае каля дзевяці гектараў. Ён будзе «звязаны» са Спаса-Еўфрасінеўскім манастыром з дапамогай воднага турыстычнага



Фота БЕЛТА.

маршруту па рацэ Палата. Прадугледжана таксама будаўніцтва і абсталяванне аб'ектаў грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання, месцаў пражывання, зоны археалогіі, адпачынку і гандлю ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі.

Пры ўсім гэтым духоўная, старажытная частка Полацка і сучасная, свецкая не будуць перашкаджаць адна другой. Ужо ў 2015 годзе ўсё запланаванае намечана зрабіць.

***— Безумоўна, гараджан цікавіць, як сёння выконваецца Комплексная праграма развіцця Полацка на 2008—2012 гады, зацверджаная Указам Прэзідэнта.***

— Прадугледжаны рэстаўрацыя кінавідэацэнтра «Радзіма» і Доміка Пятра І, рамонт гарадскіх вуліц, глядзельнай залы Гарадскога палаца культуры, спарткомплексаў «Спартак» і «Хімік», стадыёна «Лакаматыў» і шмат іншага. Павінны быць праведзены капітальны рамонт жылля, пабудаваны дзіцячы садок у мікрараёне «Аэрапорт», завершаны праект водазабеспячэння ў раёнах індывідуальнай забудовы «Спас-Слабада», «Лазоўка», «Грамы» і вадаводаў інжынерных сетак у мікрараёне «Аэрапорт», выведзены з зоны запаведніка на Верхнім замку ўстановы аховы здароўя.

Сёння многія мерапрыемствы Праграмы выкананы, але застаюцца і праблемныя пазіцыі — напрыклад, будаўніцтва пешаходнага моста цераз Заходнюю Дзвіну, Палаца гульнявых відаў спорту.

Губернатар падтрымаў ідэю гарадскіх улад рэканструяваць былы Дом афіцэраў пад канцэртную залу, але запатрабаваў дакладна вызначыць, якія перспектывы ў гэтага аб'екта культуры...

СТАР 8

# ЗАЎСЁДЫ РАЗАМ СА СВАІМІ ЧЫТАЧАМІ

95 ЗВЯЗДА

**Учора ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбылася рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Газета «Звязда» ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі», прымеркаваная да 95-годдзя заснавання выдання і 70-годдзя выхаду першага нумара падпольнай «Звязды» ў гады Вялікай Айчыннай вайны.**

**Удзельнікам рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі**
***«Газета «Звязда» ў грамадска-палітычным і культурным жыцці беларусі (да 95-годдзя заснавання і 70-годдзя першага падпольнага выхаду «Звязды» ў гады Вялікай Айчыннай вайны)»***

*Паважаныя сябры!*

*Шчыра вітаю вас на рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 95-годдзю заснавання газеты «Звязда» і 70-годдзю першага выпуску выдання ў гады Вялікай Айчыннай вайны.*

*Гісторыя «Звязды» непарыўна звязана з гераічным мінулым нашай краіны. Старонкі газеты — дакладны і праўдзівы летапіс жыцця беларускага народа. Газеце належыць адметная роля ў станаўленні і развіцці беларускіх друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, фарміраванні высокіх традыцый нацыянальнай журналістыкі, выхаванні цэлай плеяды выдатных прафесіяналаў.*

*«Звязда» з'яўляецца нацыянальна-культурным набыткам беларускага народа. Па яе матэрыялах можна вывучаць гісторыю Беларусі са жніўня 1917 года па сённяшні дзень — і гераічную, і складаную, і часам трагічную.*

*У гады Вялікай Айчыннай вайны «Звязда» выходзіла ў падполлі ў Мінску, пасля — у партызанскай зоне на востраве Зыслаў Любанскага раёна. У гэты цяжкі для краіны час яна мужным друкаваным словам заклікала чытачоў на барацьбу з ворагам.*

*Высокай адзнакай ролі газеты сталі ордэны Айчыннай вайны І ступені і Працоўнага Чырвонага Сцяга.*

*Сёння «Звязда» — адзіная беларускамоўная штодзённая грамадска-палітычная газета ў рэспубліцы. Безумоўным прыярытэтам у працы рэдакцыйнага калектыву з'яўляецца прапаганда нацыянальнай культуры, гістарычнай спадчыны нашага народа.*

*Журналісты «Звязды» заўсёды трымаюць руку на пульсе жыцця краіны. Аб'ектыўнае і ўсебаковае інфармаванне чытачоў пра падзеі на Беларусі і ў замежжы садзейнічае вырашэнню задач сацыяльна-эканамічнага развіцця, патрыятычнаму і духоўнаму выхаванню грамадзян краіны.*

*Упэўнены, што падчас канферэнцыі адбудзецца зацікаўленае і плённае абмеркаванне актуальных пытанняў гісторыі, сучаснага стану і перспектыў развіцця беларускай журналістыкі, а вынікам стане далейшае павышэнне прафесійнага ўзроўню і грамадскай значнасці айчынных сродкаў масавай інфармацыі.*

*Шчыра жадаю вам паспяховай работы і ўсяго самага найлепшага!*

**Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ.**

* * *

На канферэнцыю было замоўлена звыш 50 дакладаў.

Відаць, супрацоўнікам «Звязды» накавана лёсам адлюстроўваць пераломныя моманты жыцця беларускага народа. Гэтая думка чырвонай ніткай праходзіла літаральна праз усе выступленні ўдзельнікаў канферэнцыі. З самага пачатку заснавання «Звязда» (першыя нумары выходзілі тыражом не больш за 1500 экзэмпляраў) праявіла байцоўскі характар. І далей у гады цяжкіх выпрабаванняў, асабліва ў перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі, і ў гады пасляваеннага аднаўлення разбуранай ушчэнт рэспублікі, калектыў рэдакцыі з гонарам нёс звяздоўскі сцяг.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Удзельнікі канферэнцыі: Май Данцыг, народны мастак Беларусі, прафесар, унук Герца Данцыга, і Галіна Каржанеўская, дачка мінскага падпольшчыка, распаўсюджвальніка падпольнай «Звязды» Мікалая Каржанеўскага.**

Акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар Аляксандр Каваленя, у прыватнасці, зазначыў, што цяжка знайсці чалавека, які б не ведаў «Звязды». Амаль стагоддзе гучыць яе страснае, палымянае слова. Гісторыя газеты — гэта 95-гадовая гісторыя беларускага народа. «Звязда» — гэта і своеасаблівы летапісец нашай эпохі. І якія выпрабаванні ні выпадалі б на лёс газеты, яна заўсёды разам са сваімі чытачамі, лічыць Аляксандр Аляксандравіч.

Дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Вячаслаў Даніловіч параўнаў «Звязду» з настаўніцай жыцця, назваў яе флагманам беларускага друку. Біяграфія газеты цесна звязана з лёсам краіны, напоўненым яркімі незабыўнымі старонкамі, якімі можна і трэба ганарыцца, упэўнены навукоўца.

Пра асобныя, малавядомыя не толькі шырокай публіцы, але нават і спецыялістам, моманты існавання «Звязды» ў вельмі складаны рэвалюцыйны перыяд яе станаўлення (1917—1920 гг.) нагадаў вядомы палітолаг, галоўны рэдактар часопіса «Беларуская думка», кандыдат гістарычных навук, намеснік старшыні Беларускага саюза журналістаў Вадзім Гігін. На думку даследчыка, нумары «Звязды» за гэты час можна разглядаць як важную крыніцу гістарычных дакументаў.

Увогуле словы «гісторыя», «гістарычны» гучалі часта ў час канферэнцыі. Шмат цікавага расказалі і тыя, хто меў дачыненне да сапраўды велічных гістарычных падзей. Аб іх расказалі прысутным Май Вольфавіч Данцыг, народны мастак Беларусі, прафесар, унук Герца Данцыга, у друкарні якога ўбачыў свет першы нумар газеты «Звязда». Галіна Мікалаеўна Каржанеўская, дачка мінскага падпольшчыка Мікалая Каржанеўскага, распаўсюджвальніка падпольнай «Звязды», была таксама сярод удзельнікаў канферэнцыі.

У «Звязды» славутая гісторыя і славутыя традыцыі, якія маюць вельмі нямногія выданні на постсавецкай прасторы. Гэтыя словы належаць намесніку міністра інфармацыі Уладзіміру Матусевічу. Газета стала інтэлектуальным, рэсурсным цэнтрам нацыянальнай культуры, нацыянальнай навукі, гістарычнай спадчыны беларусаў. І сёння газета актыўна ўдзельнічае ў фарміраванні інфармацыйнага поля Беларусі. Хутка ў рэдакцыі з'явяцца новыя дадатковыя магчымасці: «Звязда» ўзбуйняецца структурна. На яе базе будзе створаны выдавецкі дом «Звязда», у які ўвойдуць не толькі беларускамоўныя грамадска-палітычныя СМІ, але і шэраг мастацка-літаратурных і культуралагічных часопісаў. У гэтай сувязі «Звязда» мае ўсе шанцы стаць крэатыўным цэнтрам нацыянальных і культурных ініцыятыў, карысных для ўсёй краіны і грамадства, паведаміў намеснік міністра інфармацыі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

## УДЗЕНЬ БЕЗ ДАЖДЖОЎ, А ЎНАЧЫ ХОЛАДНА

**Сёння ў Беларусі захаваецца халаднаватае і сухое надвор'е. Максімальная тэмпература ўдзень 15—21 цяпла, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Істотна не зменіцца характар надвор'я і ў суботу, калі на тэрыторыі краіны будзе гаспадарыць скандынаўскі антыцыклон. На працягу сутак малавоблачна і без дажджоў. Тэмпература паветра ў ноч на суботу ўсяго 3—9 цяпла, а ўдзень сонейка прыгрэе да 17—23 градусаў.

А вось у нядзелю, паводле падлікаў сіноптыкаў, атмасферны фронт з боку Балтыйскага мора прынясе ў паўночныя раёны Беларусі кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы будзе яшчэ даволі халаднавата — 4—10 цяпла, удзень — ад 16 градусаў па поўначы да плюс 23 на поўні Беларусі.

У панядзелак і аўторак тэрыторыя нашай краіны трапіць у зону паніжанага атмасфернага ціску. Таму ўначы месцамі, а ўдзень паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах — навальніцы. Уначы будзе 5—12 цяпла, удзень — ад 18 да 25 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у сераду атмасферны ціск пачне павялічвацца, таму невялікія дажджы будуць назірацца толькі месцамі. Пацяплее. У ноч на сераду тэмпература паветра ўжо 7—14 цяпла, удзень — ад 21 градусаў на поўначы да плюс 28 на поўдні Беларусі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.05.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8260,00 | ■ |
| Еўра | 10360,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 261,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1021,01 | ▼ |




## КОРАТКА

Прадстаўнікі органаў дзяржаўнай улады Беларусі правялі ў Лондане з 22 па 24 мая шэраг дзелавых сустрэч і перагавораў з кіраўнікамі вядучых міжнародных інвестыцыйных кампаній, паведамілі ў прэс-службе беларускага ўрада. Абмяркоўвалася бягучая сітуацыя ў эканоміцы рэспублікі, а таксама каротка- і сярэднетэрміновыя мэты яе развіцця, практыка выкарыстання інструментаў макраэканамічнай палітыкі краіны.

Беларускае Міністэрства замежных спраў не бачыць неабходнасці ў павелічэнні колькасці польскіх консульскіх супрацоўнікаў у Беларусі, паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Савіных. Цяпер польскую консульскую службу ў Беларусі прадстаўляюць 26 консульскіх супрацоўнікаў. У Польшчы працуюць толькі 12 беларускіх консулаў. Нагрузка па выдачы віз на аднаго консула прыкладна супастаўная. Разам з тым чэргі ў беларускіх загранустановах непараўнальна меншыя.

Сярэдняя заработная плата ў Мінску ў красавіку гэтага года дасягнула Br4 млн 174,2 тыс., паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Мінск традыцыйна лідзіруе ў Беларусі па ўзроўні намінальнай налічанай сярэдняй заработнай платы. На другой пазіцыі — Мінская вобласць (Br3 млн 215,8 тыс.). Красавіцкі сярэдні заробак у Гомельскай вобласці быў роўны Br3 млн 160,9 тыс., у Магілёўскай — Br2 млн 962,1 тыс., у Гродзенскай — Br2 млн 954,2 тыс., у Віцебскай — Br2 млн 938,7 тыс., у Брэсцкай вобласці — Br2 млн 820,4 тыс.

## ВЕЛАГОНШЧЫЦУ ПАЛІНУ ЖУК ПАХАВАЮЦЬ НА РАДЗІМЕ

**Пахаванне велагоншчыцы Паліны Жук адбудзецца 26 мая ў Брэсце. Аб гэтым паведаміў БЕЛТА намеснік начальніка ўпраўлення па фізічнай культуры, спорце і турызме Брэсцкага аблвыканкама Іван Шкутнік.**

20-гадовая спартсменка Паліна Жук увечары 22 мая няўдала ўпала ў час міжнародных спаборніцтваў «Вялікі прыз Тулы», якія праводзяцца на адкрытым трэку з бетонным пакрыццём. Спартсменка стукнулася галавой аб пакрыццё трэка, яе шлем раскалоўся. Велагоншчыцу даставілі ў бальніцу, дзе ёй правялі аперацыю, да якой былі прыцягнуты спецыялісты НДІ хуткай дапамогі імя Скліфасоўскага і Ваеннага клінічнага шпіталя імя М.Н. Бурдэнкі. Аднак і пасля аперацыі стан дзяўчыны расцэньваўся як цяжкі, яна знаходзілася ў коме. Вечарам 23 мая велагоншчыца памерла.

На радзіму ў Брэст цела Паліны Жук павінны былі даставіць учора позна вечарам або ноччу. Грамадзянская паніхіда назначана на 26 мая. Яна пройдзе ў ДЮСШ № 2 Брэста з 11.00 да 13.00. Пахаваюць Паліну ў гэты ж дзень на гарадскіх могілках «Плоска».

Гарадскія ўлады, упраўленне па фізічнай культуры, спорце і турызме Брэсцкага аблвыканкама аказваюць садзейнічанне сваякам па ўсіх арганізацыйных пытаннях. Гарвыканкам па просьбе сваякоў сваім рашэннем дазволіў пахаваць Паліну Жук на могілках «Плоска», якія ўжо некалькі гадоў закрыты для пахавання.

У чэрвені Паліне Жук павінен быў споўніцца 21 год. Выхаванка брэсцкай ДЮСШ № 2, выпускніца Брэсцкага абласнога вучылішча алімпійскага рэзерву, майстар спорту Беларусі па веласпорце, апошнім часам яна займалася ў рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па веласпорце ў Мінску, з'яўлялася членам нацыянальнай каманды па веласпорце.

ISSN 1990 - 763X

## НА ФІНАНСАВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ СПЕЦФОНДУ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ ПА ПАДТРЫМЦЫ ТАЛЕНАВІТАЙ МОЛАДЗІ НАКІРАВАНА BR1,4 МЛРД

**На фінансаванне расходаў, звязаных з дзейнасцю спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, у 2012 годзе накіравана Br1,4 млрд. Адпаведнае распараджэнне падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.**

Гэтыя сродкі сёлета будуць расходаваны на матэрыяльнае заахвочванне лепшых прадстаўнікоў таленавітай моладзі, арганізацыю і правядзенне міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў, выставак, іншых мерапрыемстваў па выяўленні і прапагандзе творчасці маладых талентаў, набыццё музычных інструментаў, сцэнічных касцюмаў, матэрыялаў, абсталявання для заняткаў мастацкай творчасцю і іншыя мэты, звязаныя з пошукам, прафесійнай падрыхтоўкай і ўдасканаленнем майстэрства юных талентаў.

Распараджэннем таксама зацверджана рашэнне савета фонду аб выдзяленні амаль Br562,5 млн са сродкаў фонду. Гэтыя сродкі накіраваны на выплату прэмій, гранд-прэмій і стыпендый фонду, аказанне матэрыяльнай дапамогі навучэнцам (каля Br149 млн); набыццё абсталявання, музычных інструментаў (амаль Br231 млн); арганізацыю і правядзенне эстраднага канцэрта лаўрэатаў, стыпендыятаў і дыпламантаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі (Br150 млн); накіраванне студэнтаў і выкладчыкаў на навучанне і стажыроўкі ў замежныя ВНУ (прыкладна Br32,7 млн).

Яшчэ адным распараджэннем кіраўніка дзяржавы зацверджана рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, згодна з якім назначаны грашовыя прэміі з уручэннем нагруднага знака лаўрэата фонду пераможцам студэнцкага каманднага чэмпіянату свету па праграмаванні (Польшча, 2012 год).

Грашовыя прэміі ў памеры Br4,5 млн назначаны членам каманды (3 чалавекі) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, якая заваявала сярэбраны медаль.

Члены каманды (3 чалавекі) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, якая заваявала бронзавы медаль, заахвочаны прэміямі ў памеры Br4 млн.

Прыняцце распараджэнняў з'яўляецца сведчаннем пастаяннай дзяржаўнай падтрымкі адораных навучэнцаў і студэнтаў, лепшых прадстаўнікоў таленавітай моладзі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

## ПАРЛАМЕНЦКІ СХОД САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ АБМЯРКУЕ РОЛЮ СМІ І БАРАЦЬБУ СА ЗЛАЧЫННАСЦЮ

**Пра гэта паведаміў учора Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір Андрэйчанка на сустрэчы з дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Рыгорам Рапотам.**

Чарговая сесія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі адбудзецца ў Мінску 28 чэрвеня. «Парадак дня яшчэ да канца не ўзгоднены, але чакаецца, што будуць абмяркоўвацца месца і роля СМІ ў пытаннях далейшага будаўніцтва Саюзнай дзяржавы, — сказаў спікер беларускага парламента. — Таксама плануецца абмеркаваць выкананне бюджэту і саюзнай праграмы па барацьбе са злачыннасцю». Старшыня Палаты прадстаўнікоў дадаў, што ў Саюзнай дзяржаве створаны ўнікальны механізм узаемадзеяння, досыць эфектыўна працуюць сумесныя органы, дзякуючы чаму з'явілася база для фарміравання Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы. У сваю чаргу, Рыгор Рапота падкрэсліў, што кантакты з парламентарыямі вельмі важныя і што ў саюзнай інтэграцыі створана вельмі цікавая практыка рэалізацыі праграм, якой няма больш ні ў адной інтэграцыйнай структуры. Расходная частка бюджэту Саюзнай дзяржавы на гэты год складае каля 5 млн расійскіх рублёў і прадугледжвае фінансаванне 13 праграм і 26 мерапрыемстваў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ЖУРНАЛІСТЫ ЗВЕРАЦЬ АРЫЕНЦІРЫ

### СЛОВА «ПАРТНЁРСТВА» СТАНЕ КЛЮЧАВЫМ ДЛЯ VII БЕЛАРУСКАГА МІЖНАРОДНАГА МЕДЫЯФОРУМУ

**Сёлета на форум у Мінск, які пройдзе з 28 па 31 мая, акрамя вядомых медыйных персон, упершыню прыедзе большасць кіраўнікоў інфармацыйных агенцтваў краін СНД і дэканы факультэтаў журналістыкі краін Садружнасці. Першыя збяруцца на інфармацыйны савет, а другія абмяркуюць тэму медыйнай адукацыі ў XXI стагоддзі. Падобнай «зверкі гадзіннікаў» у інфармацыйнай прасторы постсавецкіх краін яшчэ не рабілі.**

— Наш форум перарос рамкі толькі медыйнага мерапрыемства, — лічыць **першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія АНАНІЧ.** — На першых сустрэчах мы казалі пра адказнасць СМІ і пра нашы прафесійныя задачы, але сродкі масавай інфармацыі, як ніякая іншая грамадска-дзяржаўная структура, знаходзяцца ў цэнтры ўвагі ўсіх з'яў і працэсаў, што адбываюцца ў свеце. Таму мы вырашылі абмеркаваць з журналістамі і вядомымі экспертамі не толькі медыйныя праблемы, але і сусветныя тэндэнцыі ў геапалітыцы.

Гэтая ідэя закладзена ў тэму форуму: «Партнёрства ў імя будучыні: мадэлі новай эпохі». Асноўны ўпор будзе зроблены на новую геапалітыку Еўаразіі і інтэграцыйныя працэсы. Разам з тым, досыць цікавымі абяцаюць быць адкрытыя дыскусіі вакол уплыву новых тэхналогій на развіццё традыцыйных СМІ і ролі журналістыкі ў глабалізацыі.

Традыцыйна ў рамках форуму пройдзе Летняя школа журналістыкі, дзе, акрамя «круглага стала», адбудзецца шэраг майстар-класаў вядомых беларускіх, украінскіх і расійскіх журналістаў. У ліку «выкладчыкаў» выступяць расійскі тэлевядучы Уладзімір Бярэзін, расійскі журналіст Віталь Траццякоў, украінскі аглядальнік Ігар Слісарэнка, доктар палітычных навук Ігар Панарын. Упершыню, акрамя мэтраў, сваімі сакрэтамі поспеху падзеляцца і маладыя майстры слова. Шмат увагі ў Летняй школе будзе нададзена інтэрнэт-тэхналогіям. Цікавай павінна адбыцца творчая сустрэча з госцем з Індыі — доктарам Свамі Партасарацi, які кіруе Індыйскім інстытутам менеджменту і даследаванняў.

Яшчэ адной навінкай стане старт фестывалю тэлепраграм «Вобраз часу». Сёлета конкурс будзе толькі аб'яўлены, першыя вынікі падвядуць праз год — на VIII Беларускім міжнародным медыяфоруме. Задача фестывалю — садзейнічаць стварэнню глыбокіх аналітычных праграм на нацыянальных тэлеканалах і з'яўленню іх на каналах іншых краін.

— Мы жадаем, каб на наступныя нашы форумы прыязджалі як праграмы-пераможцы, так і іх героі, — сказала Лілія Ананіч. — Каб мы больш ведалі адзін пра аднаго, пра дасягненні нашых суседзяў і разам клапаціліся пра інфармацыйнае ствральнае поле.

16 краін будуць прадстаўлены на сёлетнім медыяфоруме. Акрамя постсавецкай прасторы, гэта Куба, Індыя, Венесуэла і Кітай.

Арганізатарамі форуму выступаюць Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы, Міждзяржаўны фонд гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД і Беларускі Саюз журналістаў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# Лепшыя экспарцёры 2011 года аб'яўлены ў «Мінск-Арэне»

**Пераможцы рэспубліканскага конкурсу «Лепшы экспарцёр 2011 года» былі ўганараваны і атрымалі прызы на ўрачыстай цырымоніі ўчора ў «Мінск-Арэне». Сёлета пераможцы былі вызначаны ў 17 намінацыях, яшчэ 11 кампаній атрымалі заахвочвальныя дыпломы, а ААТ «Бабулін гладыш» атрымала спецыяльны прыз Беларускай гандлёва-прамысловай палаты «За стабільна высокія паказчыкі ў экспарце і прасоўванні на знешнія рынкі тавараў беларускай вытворчасці».**

— Конкурс мы праводзім больш за 10 гадоў. Ён калісьці пачынаўся з трох намінацый і толькі для членаў палаты, а зараз набыў рэспубліканскае значэнне. Да яго ўважліва ставяцца нашы экспарцёры, і сёлета конкурс праведзены па 18 намінацыях, — сказаў Міхаіл МЯТЛІКАЎ, старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты.

Такім чынам, лепшымі экспарцёрамі мінулага года былі прызнаны «Гефест-тэхніка», «Барысаўскі ДОК», «Эксадэл», «Мілавіца», «Асіповіцкі доследны лясгас», «АвантРэйл», «Мінскі аўтамабільны завод», «Рэчыцкі метызны завод», «Савушкін прадукт», «Смалявіцкая бройлерная птушкафабрыка», «Магілёўскі камбінат сілікатных вырабаў», «Фрэзеніус-Барысаў-Дыялізатэхнік», «Стэлкарга», «Альянспласт», «Нафтан», «Атамтэх» і «Магілёўскі завод «Электрарухавік». У адной намінацыі, якая тычылася індывідуальных прадпрымальнікаў-экспарцёраў, пераможца не быў вызначаны, бо ні мясцовыя органы ўлады, ні іншыя дзяржорганы, ні бізнэс-саюзы на гэтую намінацыю не вылучылі ніводнага кандыдата.

— Найбольшая колькасць намінантаў была ў намінацыях харчовай прамысловасці і машынабудавання, — расказвае Алена ШАБАЛІНА, начальнік упраўлення інфармацыйнага і арганізацыйнага забеспячэння БелГПП. — Але крытэрыі былі адны для ўсіх — аб'ём экспарту ў фактычных цэнах у доларах, змяненне аб'ёмаў экспарту за справаздачны перыяд у параўнанні з мінулым перыядам, сальда знешнегандлёвай дзейнасці і аб'ём экспарту ў фактычных цэнах на аднаго працаўніка. Калі ў прадпрыемстваў у адной намінацыі раптам атрымліваюцца аднолькавыя лічбы па гэтых паказчыках, ёсць цэлы шэраг дадатковых крытэрыяў — рэалізацыя маркетынгавых планаў, геаграфія экспарту, укараненне новых тэхналогій і г. д.

Цікава, што важнасць экспарту для краіны разумеюць і самі экспарцёры. Як лічыць Уладзімір ВАЎЧОК, першы намеснік генеральнага дырэктара ААТ «БелАЗ» (гэтае прадпрыемства было лепшым экспарцёрам у 2010 годзе), «экспарт сёння не толькі эканамічная катэгорыя, але і палітычны поспех нашай краіны, гэта магчымасць адчуць сябе прызнаным не толькі ў межах краіны, але і значным вытворцам на сусветных рынках».

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# МОЛАДЗЬ БУДУЕ ДЛЯ МОЛАДЗІ

### А ТАКСАМА ДЛЯ ПЕНСІЯНЕРАЎ, ЯКІМ У МОЛАДЗЕВЫМ ЦЭНТРЫ «ГРОДНА» ДАПАМОГУЦЬ АСВОІЦЬ КАМП'ЮТАР

**Будынак былога кінатэатра «Гродна» па вуліцы Савецкай у гістарычным цэнтры горада над Нёманам, які прастаяў практычна незапатрабаваным больш за дзесяць гадоў, атрымлівае другое жыццё. У гэтыя дні тут завяршаюцца будаўнічыя работы і ўжо зусім хутка адчыніць дзверы для наведвальнікаў першы ў краіне шматпрофільны моладзевы цэнтр. Прычым яго паслугамі змогуць скарыстацца людзі самага рознага ўзросту, у тым ліку і пенсіянеры.**

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.



Праект моладзевага цэнтра, які даўно «блукаў» у галовах гродзенскіх студэнтаў, быў падтрыманы старшынёй аблвыканкама Сямёнам Шапірам і ажыццяўляецца з леташняга ліпеня. Фінансаванне — з інавацыйнай праграмы вобласці. А за «начыненне» цэнтра ідэямі (праект выдатна «выступіў» на рэспубліканскім конкурсе «100 ідэй Беларусі»), распрацоўку яго бізнэс-плана актыўна ўзялася сама моладзь. Ды і будаўнікі трэста № 30, як пераканаўся аўтар гэтых радкоў, — таксама ў асноўным маладыя людзі. Будуюць жа ў тым ліку і для сябе.

— Чым жа адрозніваецца гэты цэнтр ад дзейных забаўляльных клубаў і дыскатэк, у чым крэатыў, інавацыя? — цікаўлюся ў першага сакратара Гродзенскага абласнога камітэта БРСМ Юрыя Аляксея.

Юрый знаёміць з некаторымі першапачатковымі задумамі, якія ў далейшым могуць дапаўняцца новымі «фішкамі». Напрыклад, адным з навасельцаў моладзевага цэнтра «Гродна» стане школа дыджэяў і вядучых, створаная пры гарадскім камітэце БРСМ. А танц-падлога будзе выкарыстоўвацца не толькі для дыскатэк, але і для трэніровак аматараў брэйк-дансу і іншых танцавальных кірункаў. У адзін з дзён тыдня галоўнымі дзеючымі асобамі цэнтра будуць студэнты (танныя ўваходныя білеты), у іншы — можна будзе прыйсці ў моладзевы цэнтр як у канцэртную залу — на выступленні артыстаў ці Клуба вясёлых і знаходлівых. Альбо трэба правесці нейкую імпрэзу таму ці іншаму факультэту Купалаўскага, медыцынскага ці аграрнага ўніверсітэтаў — калі ласка, да вашых паслуг і зала, і кавярня.

Дарэчы, адна з трох кавярняў на першым паверсе зроблена ў стылі «графіці», прычым да яе афармлення прыклалі свае ідэі і рукі гродзенскія аматары. А спецыялісты дызайн-групы інстытута «Гроднаграмадзянпраект» пастараліся ўпрыгожыць інтэр'ер моладзевага цэнтра выявамі старога горада з яго архітэктурнымі славутасцямі.

— Мяркуем, што ў дзённы час цэнтр будзе працаваць на рэалізацыю творчага патэнцыялу моладзі, аказанне ім розных паслуг (напрыклад, кансультацыі ўрачоў). А сродкі, зробленыя начным клубам і іншымі платнымі кірункамі, пасадзейнічаюць выхаду нашай арганізацыі на самафінансаванне і пойдуць на рэалізацыю дзяржаўнай моладзевай палітыкі, — кажа Юрый Аляксей. — Пры гэтым адна з галоўных задач — працаўладкаванне студэнтаў. У нашых планах стварыць у цэнтры менавіта моладзевую каманду, каб задзейнічаць выпускнікоў таго ж гандлёвага каледжа і іншых навучальных устаноў.

Акрамя таго, тут будзе інтэрнэт-клуб для вельмі папулярных цяпер спаборніцтваў паміж аматарамі ваенных камп'ютарных гульняў. І хто ведае, можа, у першынстве па кіберспорце мы неўзабаве ўбачым не толькі школьнікаў, студэнтаў і іншых маладых людзей, але і каманду пенсіянераў, якім у моладзевым цэнтры «Гродна» дапамогуць асвоіць камп'ютар — бясплатна, было б толькі жаданне. Адпаведная дамоўленасць з кіраўніцтвам абласной ветэранскай арганізацыі ўжо ёсць.

А за першай «ластаўкай» — другая. Ужо ў наступным годзе ў Гродне па праспекце Касманаўтаў плануецца здаць у эксплуатацыю другі, значна большы па плошчы моладзевы цэнтр. Там будуць дзве танц-падлогі, а таксама школа прыгажосці, спа-салоны, цырульні... І тут, зноў жа, ёсць перспектыва працаўладкавання для моладзі — да прыкладу, выпускнікоў Гродзенскага каледжа бытавога абслугоўвання. Акрамя таго, будуецца боўлінг на восем дарожак, спартыўны бар з шырокім экранам, дзе можна сабрацца балельшчыкам для прагляду тых ці іншых матчаў. Паралельна ствараюцца ўмовы для бацькоў, якія прыйдуць сюды з малымі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

**МИНСКИЙ РАЙИСПОЛКОМ ОТКАЗЫВАЕТСЯ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ 1 июня 2012 года В ОТНОШЕНИИ СЛЕДУЮЩЕГО ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА:**

1) Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома площадью 0,1497 га, Минский район, г. Заславль, ул. Хмелевка, 54а, кадастровый номер земельного участка 623650100001004555. (Лот 1).

УНП 600012999

# БУДУЧЫЯ ГІМНАЗІСТЫ, НА СТАРТ...

### ПРЫЁМ ДАКУМЕНТАЎ АД АХВОТНЫХ ПАСТУПІЦЬ У ГІМНАЗІІ РАСПАЧЫНАЕЦЦА 25 МАЯ

**У сталіцы ў наступным навучальным годзе будуць дзейнічаць 49 гімназій — плюс чатыры новыя гімназіі ў параўнанні з папярэднім годам. Статус гімназіі набылі сярэднія школы №№ 184, 193, 222 і 41. Як расказала начальнік аддзела дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Марына Юркевіч, у новых гімназіях набор вучняў будзе ажыццяўляцца не толькі ў пятыя, але і ў дзясятыя класы.**

Усяго ў гэтым годзе ў 5-я класы сталічных гімназій плануецца прыняць каля 3,5 тысячы чалавек (летась было прынята 3227 навучэнцаў). Падача дакументаў у гімназіі завяршаецца 1 чэрвеня. Конкурсны адбор у 5-я класы гімназій пройдзе з 2 па 10 чэрвеня, а ў 10-я класы — з 15 па 20 чэрвеня. Для будучых гімназістаў пад правядзенне ўступных экзаменаў забраніраваны наступныя дні: 5 чэрвеня пройдзе дыктоўка па рускай мове, 7 чэрвеня дзеці будуць здаваць матэматыку ў пісьмовай форме, а 9 чэрвеня — пісаць дыктоўку па беларускай мове. Пры паступленні ў гімназіі-каледжы мастацтваў вучні здаюць адзін, так бы мовіць, профільны экзамен па мастацтве плюс матэматыку і экзамен па беларускай ці рускай мове (на выбар). Уступныя экзамены ў гімназіі-каледжы мастацтваў па вучэбных прадметах «беларуская мова», «руская мова» і «матэматыка» будуць праводзіцца ў тэрміны, устаноўленыя для ўсіх гімназій, а іспыты па мастацкіх дысцыплінах (музыцы, малюнку, вакале і г.д.) пройдуць 2 чэрвеня.

Марына Юркевіч дадала, што ў гэтым годзе вызначаны адзін рэзервовы дзень (11 чэрвеня) для тых навучэнцаў, якія па ўважлівай прычыне прапусцілі адзін з уступных іспытаў. У кожным раёне горада пад гэтыя мэты выдзелена адна навучальная ўстанова. Для тых, хто паступае ў 10-я гімназічныя класы, рэзервовы дзень — 22 чэрвеня.

Трэба нагадаць, што з мінулага года ўмовы паступлення ў гімназіі былі зменены. У прыватнасці, цяпер прыём у гімназію ажыццяўляецца як на аснове вынікаў уступных іспытаў, так і з улікам гадавых адзнак за чацвёрты клас па тых вучэбных прадметах, па якіх праводзяцца экзамены. Такім чынам, максімальная сума балаў, якую можа набраць вучань пры паступленні, складае 60. Залічэнне ў гімназію з улікам гадавых адзнак павышае прэстыж той адзнакі, якую дзіця зарабіла за папярэднія чатыры гады навучання: яна перастае быць фармальнай. Акрамя таго, чым большая колькасць адзнак бярэцца пад увагу, тым меншая верагоднасць у прэтэндэнтаў на званне гімназіста набраць аднолькавую колькасць балаў.

Варта мець на ўвазе, што пры роўнай колькасці балаў пераважнае права на залічэнне ў гімназіі будуць мець дзеці з больш высокім сярэднім балам гадавых адзнак за 4 клас, а ў гімназіях-каледжах мастацтваў — дзеці з больш высокім узроўнем здольнасцяў у асобных відах мастацтваў.

Залічэнне ў 5-я класы гімназій пройдзе да 12 чэрвеня, а ў 10-я класы — да 25 чэрвеня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ЛЕТА КЛІЧА НА АЗДАРАЎЛЕННЕ

**У летні перыяд 2012 года арганізаванымі формамі аздараўлення ў лагерах усіх тыпаў будуць ахоплены каля 78 тысяч мінскіх школьнікаў, або кожны другі.**
**З 4 чэрвеня распачнуць работу 242 лагеры дзённага знаходжання навучэнцаў на базе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, устаноў дадатковай адукацыі і фізкультурна-спартыўных цэнтраў дзяцей і моладзі.**

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



Як расказалі журналістам на прэс-канферэнцыі ў мэрыі прадстаўнікі Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама, для зручнасці бацькоў у школьных лагерах будуць дзейнічаць гнуткія рэжымы работы: у кожнай установе адукацыі плануецца стварыць дзяжурныя групы для дзяцей малодшага школьнага ўзросту, якія будуць працаваць з 8 гадзін раніцы да 18 гадзін пры агульным рэжыме з 9.00 да 17.00. Колькасць дзяцей, якія будуць наведваць школьныя лагеры ў першую змену, складзе 80,7 працэнта ад запланаваных аб'ёмаў аздараўлення ў дзённым рэжыме: гэта звязана з высокай запатрабаванасцю гэтай вышэйназванай формы дзіцячага адпачынку ў бацькоў менавіта ў чэрвені. Акрамя таго, у рэжыме чатырох змен будуць працаваць 38 загарадных аздараўленчых лагераў на 34 тысячы месцаў, выязныя профільныя лагеры (18-дзённыя), якімі будуць ахоплены 4,5 тысячы дзяцей, і 9-дзённыя палатачныя лагеры, разлічаныя на 7,5 тысячы чалавек.

Даплата да поўнага кошту пуцёўкі на адно дзіця са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання складзе 605 тысяч рублёў у лагеры з кругласутачным знаходжаннем (змена 18 дзён), 235 тысяч рублёў — у 9-дзённых і 230 тысяч рублёў — у лагерах з дзённым знаходжаннем дзяцей. Бацькоўская плата разлічваецца ад поўнага кошту пуцёўкі і складае не менш як 10%.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## У ЛІПЕНІ НА СВАБОДУ МОГУЦЬ ВЫЙСЦІ 2800 ЧАЛАВЕК

**Дэпартамент выканання пакаранняў МУС Беларусі падрыхтаваў праект Закона «Аб амністыі», які быў узгоднены з зацікаўленымі дзяржорганамі і ўнесены на разгляд у Савет Міністраў для далейшага прадстаўлення Прэзідэнту. Гэты нарматыўны прававы акт не мае значных адрозненняў ад папярэдніх законаў аб амністыі.**

Паводле папярэдніх ацэнак, з месцаў пазбаўлення волі будзе вызвалена каля 2800 чалавек. Плануецца таксама скараціць тэрмін пакарання на 1 год больш як 7 тысячам асуджаных. Калі прапанаваны варыянт будзе адобраны ўсімі інстанцыямі, то ў ліпені будуць вызваленыя няпоўнагадовыя, цяжарныя жанчыны; жанчыны і адзінокія мужчыны, якія маюць няпоўнагадовых дзяцей; інваліды I і II груп, хворыя з анкалагічнымі захворваннямі, удзельнікі ліквідацыі наступстваў на ЧАЭС, пацярпелыя ад катастрофы на ЧАЭС, ветэраны баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў. Будуць вызвалены і асобы, якія ўчынілі злачынствы, што не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі, і злачынствы, якія адносяцца да катэгорыі менш цяжкіх, але пры ўмове вяртання нанесеных страт.

Амністыя-2012, як сказана ў праекце, не распаўсюджваецца на тых, да каго раней прымяняўся адпаведны закон. Не падлягаюць амністыі асобы, якія не вярнулі страты, нанесеныя злачынствам, і грамадзяне, якія не вярнулі дзяржаве даход, атрыманы ад незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці. Не будуць вызвалены і небяспечныя рэцыдывісты, тыя, хто не вярнуў расходы на дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, аб'яўленыя ў вышук з-за ўхілення адбывання пакарання па прысудзе суда.

У Дэпартаменце выканання пакаранняў падкрэслілі, што амністыя не распаўсюджваецца на тых асоб, якія злосна парушаюць устаноўлены парадак адбывання пакарання. Цяперашні закон — дванаццаты, пачынаючы з 1991 года. У выніку мінулагодняй амністыі было вызвалена 2300 чалавек. Практыка паказвае, што рэцыдыў сярод раней амніставаных невялікі. Усё ж такі амністыя прымяняецца да таго, хто ўчыніў няцяжкае злачынства, упершыню парушыў закон, не парушаў устаноўленага парадку адбывання пакарання.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# «Мы не будзем спаць разам з вамі!»

### У КРАІНЕ ЧАКАЕЦЦА РЭКОРДНЫ РАДЫЁМАРАФОН — З МІКРАФОНАМ

**Такое абяцанне далі некаторыя слухачы радыё «МИР» вядучым Каці Пытлевай і Юрыю Царову, якія ў дзень пятнаццацігоддзя радыёстанцыі, што прыпадае на 26 мая, сабраліся правесці за мікрафонам ні больш ні менш 26 гадзін! Гэта безумоўны рэкорд для беларускага радыёэфіру, які будзе зафіксаваны ў Кнізе рэкордаў краін СНД і Балтыі «Дзіва».**

